ЛІТАРАТУРА:
1. Вежбицкая, А. Язык. Культура. Познание / А. Вежбицкая. – М. : Рус. слов., 1996. – 411 с.
2. Телия, В. Н. Русская фразеология. Семантический, прагматический и лингвокультурологический аспекты / В. Н. Телия. – М. : Яз. рус. культуры, 1996. – 288 с.
3. Лепешаў, І. Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І. Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭн, 2004. – 448 с.

# МАСТАЦКАЯ ФУНКЦЫЯ ПАРАЎНАННЯ Ў АКТАВАХ НІЛА ГІЛЕВІЧА

**Урбановіч К. А.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Янкі Купалы
Навуковы кіраўнік – Тарасава С. М.

Репозиторий ГрГМУ

У энцыклапедычным даведніку В. Рагойшы “Верш. Паэзія” сустракаем наступнае азначэнне вядомага паэтычнага тропа: *“Параўнанне – такое супастаўленне двух прадметаў, з’яў або паняццяў, у выніку якога знешняя ці ўнутраная сутнасць аднаго з іх вытлумачваецца праз сутнасць другога. Параўнанне дапамагае зрабіць паэтычны малюнак па-мастацку дакладным, наглядным, жывапісным”* [1, с.97].

Таму натуральна, што параўнанне ў паэтычнай мове – неад’емная з’ява, асабліва ў творцаў яркіх, неардынарных. Да ліку такіх належыць і Ніл Гілевіч, беларускі паэт, перакладчык, празаік, драматург, літаратуразнавец з пакалення “шасцідзясятнікаў”, аўтар шматлікіх кніг паэзіі, сапраўдны майстар вобразнага паэтычнага слова.

У 1976 годзе выйшла ў свет кніга паэзіі Н. Гілевіча “Актавы”, якая стала знакавай з’явай беларускай літаратуры сярэдзіны XX ст. Вершаваная форма актавы аказалася прыдатнай для выяўлення як высокіх, узрушаных пачуццяў, так і для выкрывальна-сатырычных матываў. Гэта адзначана і даследчыкам І. Адамовіч :*“У вершах-актавах аўтар выказваў самае дарагое і запаветнае, тое,што вынашана і здабыта ў пакутных роздумах і духоўных пошуках. Ён выяўляе філасофскі роздум пра сэнс быцця, асэнсоўвае маральна-этычныя праблемы жыцця і інш.”*[2, с.206]. Лаканічнасць, ёмістасць думкі, выразнасць заяўленай пазіцыі характарызуюць змест актаў Н. Гілевіча.

Выяўленню названых адзнак пісьменніку дапамагаюць паэтычныя тропы – метафары, эпітэты і параўнанні. Але менавіта параўнанні ў вершах Ніла Гілевіча з’яўляюцца важным сродкам для стварэння вобразнай карціны свету, якую падае аўтар у сваіх паэтычных творах.

Асноўнымі функцыямі параўнання, на думку даследчыцы Н. Дзявятавай, выступаюць: 1) функцыя стварэння вобразнасці; 2) ацэначная (інтэлектуальнай і эмацыянальнай ацэнкі); 3) экспрэсіўная (экспрэсіўна-эмацыянальная і экспрэсіўна-ўзмацняльная); 4) звышарганізуючая [3, с.54].

Па сцвярджэнні даследчыка, вядучая стылістычная функцыя ўсіх тыпаў параўнання – функцыя стварэння вобразнага мыслення. Яно дае магчымасць убачыць больш за тое, што дадзена ў непасрэдным успрыманні. Прадметы павінны быць дастаткова далёкімі, каб супастаўленне іх было яркім і кідалася ў вочы.

Поліфункцыянальнасць параўнання выяўляецца і ў вершах зб. “Актавы” Н. Гілевіча. Найбольш часта ў актавах выяўляецца ацэначная функцыя параўнання, праз якую мы пазнаём аўтарскія адносіны да сябе, свету, разнастайных жыццёвых падзей і з’яў. Такая адметная ацэнка выявілася, напраклад, у актаве “У гэты век, што адвучыў маўчаць”, дзе аўтар называе сябе дзіваком, наіўным, “*смешным, як дзіця*”, бо не здольны прыстасавацца пад мудрагелістыя патрабаванні часу.

Менавіта ацэначнае параўнанне дазваляе ўбачыць у з’явах і прадметах незвычайныя праявы, як напрыклад, у актаве “Паклон табе, мой беларускі краю”. Звычайны дубовы лісток, калі ён з роднай зямлі, здольны праявіць у сабе надзвычайныя ўласцівасці – гаіць душу і сэрца паэта: “*Я зноў і зноў да сэрца прыкладаю / Твой ліст дубовы – як чароўны лек”*[4, с. 36].

Параўнанні выконваюць у актавах Н. Гілевіча і іншую функцыю – эмацыйна-экспрэсіўную, праз якую мы вызначаем душэўны стан героя, адчуваем яго настрой, пачуцці. Названая функцыя пазнаецца ў актавах, што прысвечаны тэме кахання. Трапяткія пачуцці лірычнага героя перадае параўнанне ў актаве “Нам разам трыццаць. Мы стаім на кладцы”. З пяшчотай і ласкай згадвае паэт адбіткі, пакінутыя каханай: *“На белай кладцы мокрыя слядкі – / Як першай песні мілыя радкі”*[4, с. 36].

Для найбольш дакладнага ўспрымання апісанай аўтарам з’явы ці вобразу прыдаліся паэту параўнанні, што дапамагаюць дэталізаваць навакольны свет, зрабіць яго больш наглядным. Так у актаве “Вясновы вечар. На нагах маіх” паэт узгадвае маці, раскрывае яе адчуванне навакольнага хараства. Але найперш падае просты і лаканічны малюнак вясковага маленства: *“Вясновы вечар. На нагах маіх / За доўгі дзень, як зоры, цыпкі выспелі./ Апанаваная якімісь мыслямі, / На ўсходках ганка мама гоіць іх”* [4, с. 36].

А ў актаве “Ноччу летняй, чуйнаю, як звон” параўнанне не толькі ўдакладняе слыхавы малюнак пэўнага часу сутак, але выяўляе яго ацэнку, падаючы гэты час як незвычайны, выключны, калі абвастраюцца ўсе чалавечыя адчуванні.

Такім чынам, праведзеныя назіранні за вершамі зборніка Ніла Гілевіча “Актавы” даюць магчымасць зрабіць наступныя высновы.

Актавы Н. Гілевіча раскрываюцца ва ўсёй паўнаце і шматграннасці дзякуючы ўдала выкарыстаным мастацкім сродкам. Параўнанні, прадстаўленыя ў вершах Н. Гілевіча, узмацняюць выразнасць, вобразнасць мовы, надаюць вершам паэтычную яркасць, ствараюць адмысловы інтанацыйны малюнак.Яны з’яўляюцца поліфункцыянальным паэтычным сродкам, дзякуючы якому ўзоры паэтычнай формы васьмірадковага верша ў творчасці Н. Гілевіча можна назваць прыкладам выключна эстэтычнага адлюстравання, яркага творчага мыслення, дзе спалучаюцца арыгінальнасць і мастацкасць.

Репозиторий ГрГМУ

ЛІТАРАТУРА:
1. Рагойша, В. Верш. Паэзія: энцыклапедычны даведнік / В. Рагойша. – Мінск, 2020. – 472 с.
2. Адамовіч, І. Паэзія Ніла Гілевіча: жанрава-стылёвая адметнасць / І. Адамовіч // Мова – літаратура – культура : матэрыялы IX Міжнар. навук. канф. памяці праф. А. Я. Міхневіча, Мінск, 15–16 кастр. 2020 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. А. Радзевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2020. – С. 202–207.

# ФАРМІРАВАННЕ КУЛЬТУРЫ ЧЫТАННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА АСНОВЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ

**Чурык Л. С.**

Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы
Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дацэнт Лапкоўская А. М.

У сучасным жыцці чытацкая дзейнасць з’яўляецца адной з важных форм сацыялізацыі асобы, далучэнне яе да нацыянальных культурных традыцый і сацыяльнага вопыту чалавецтва. Чытанне садзейнічае развіццю памяці, мыслення, фарміруе індывідуальную сістэму каштоўнасцей, умацоўвае стрыжань асобы, выпрацоўвае эстэтычныя адносіны да рэчаіснасці, а таксама з’яўляецца адным са сродкаў узбагачэння слоўнікавага запасу вучняў, развіцця іх звязнага маўлення і пісьменасці. Адна з галоўных мэт настаўніка – навучыць чытаць, думаць, разумець, працаваць з тэкстам, цаніць літаратуру.

Метадалагічнай асновай навучання літаратурнаму чытанню з’яўляецца культаралагічны падыход. Асноўная асветніцкая функцыя – гэта знаёмства вучняў з самабытнай беларускай народнай і аўтарскай літаратурай, традыцыямі, з’явамі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры, сучаснай беларускай дзіцячай літаратуры як элементам культуры. У працэсе навучання адбываецца разумовае і эмацыянальнае пранікненне ў сутнасць нацыянальных культур, адметнасцей беларускай літаратуры [1]. У кантэксце культуралагічнага падыходу стымулюецца пазнавальная актыўнасць вучняў у спасціжэнні гістарычных, навукова-папулярных, вобразна-мастацкіх звестак пра Беларусь, яе прыроду, гісторыю, традыцыі, побыт, міфалогію і г.д.

Для фарміравання традыцый вельмі важна даваць школьнікам пачатковае веданне пра народ, звычаі, гісторыю, культуру. Гэтыя каштоўнасці рэалізуюцца шляхам азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі народнымі святамі, з іх абрадамі, традыцыямі, песнямі, гульнямі. Задача настаўніка–раскрыць духоўны і маральны патэнцыял народнай культуры і давесці яго да дзіцяці ў даступнай форме. Таксама вялікае значэнне надаецца павелічэнню слоўнікавага запасу дзяцей шляхам сэнсавага тлумачэння незнаёмых слоў, іх

Рэпазіторый ГрДМУ